*А.С.Качан (Рэспубліка Беларусь, Мінск,*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт)*

# ВЫКАРЫСТАННЕ ІНАВАЦЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ МЕДЫЦЫНСКАЙ ЛЕКСІКІ (У РАМКАХ КУРСА "БЕЛАРУСКАЯ МОВА: ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА")

*У артыкуле разглядаецца выкарыстанне інавацыйных тэхналогій пры вывучэнні медыцынскай лексікі, апісваюцца найбольш эфектыўныя электронныя адукацыйныя рэсурсы, паказваюцца асаблівасці практычнага выкарыстання сучасных тэхналогій.*
***Ключавыя словы:*** *інавацыйныя тэхналогіі; інтэрнэт-рэсурсы; медыцынская лексіка; беларуская мова.*

*The article discusses the issue of the using innovative technologies in the study of medical vocabulary, describes the most effective electronic educational resources, shows the features of the practical use of modern technologies.*
***Keywords:*** *innovative technologies; Internet resources; medical vocabulary; Belarusian language.*

У апошнія дзесяцігоддзі ўсё большую актуальнасць набывае прымяненне інавацыйных тэхналогій у адукацыі. Методыка выкладання беларускай мовы не з’яўляецца выключэннем. Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі могуць выкарыстоўвацца на ўсіх этапах навучання: у час тлумачэння новага матэрыялу, замацавання, паўтарэння, кантролю ведаў, уменняў і навыкаў.

Трэба адзначыць, што выкарыстанне інавацыйных тэхналогій магчыма не толькі ў якасці спосабу перадачы матэрыялу студэнтам, але і пры арганізацыі дыстанцыйнага вывучэння мовы, у тым ліку і тэсціравання, што з'яўляецца карысным аргмомантам і для самога выкладчыка. Гэта могуць быць ужо гатовыя рэсурсы (даведачныя рэсурсы, адкрытыя адукацыйныя рэсурсы, трэнажоры ці сэрвісы для распрацоўкі матэрыялаў і арганізацыі навучання, сэрвісы для стварэння навучальных матэрыялаў, канструктараў тэстаў).

Нягледзячы на тое, што большасць адукацыйных рэсурсаў з'яўляюцца рускамоўнымі, у інтэрнэт-асяроддзі існуе шэраг гатовых шаблонаў, і перад выкладчыкам паўстае задача толькі распрацаваць неабходны матэрыял і запоўніць патрэбны шаблон. Усе рэсурсы простыя ў карыстанні і даюць магчымасць разнастаіць працэс навучання. У дадзеным артыкуле ўвага сканцэнтравана на рэсурсах, да якіх могуць звярнуцца выкладчыкі ў сваёй педагагічнай дзейнасці.

Сярод найбольш эфектыўных форм тлумачэння новага матэрыялу па беларускай мове неабходна назваць мультымедыйныя прэзентацыі ***Power Point*** і прэзентацыі новага пакалення – ***Prezi.*** Мультымедыйнае суправаджэнне лекцыйных і практычных заняткаў па дысцыпліне "Беларуская мова: прафесійная лексіка" стварае нагляднасць і займальнасць выкладу вучэбнага матэрыялу, актывізуе ўвагу студэнтаў, узмацняе камунікатыўны кантакт з імі.

Выкарыстанне мультымедыйных тэхналогій дазваляе спалучаць вербальную і наглядна-пачуццёвую інфармацыю, візуальнае і слыхавое ўспрыманне выкладаемага матэрыялу, дапамагае сэканоміць час і інтэнсіфікаваць выклад.

Для замацавання тэарэтычнага матэрыялу на практыцы і кантролю ведаў выкарыстоўваюцца тэсты, зробленыя ў вэб-сістэме ***Moodle***, а таксама сэрвіс ***Google-тэстаў***. У дадзеных праграмах зручна выстаўляць шкалу ацэньвання, ствараць варыянты з адным або некалькімі правільнымі адказамі, размяшчаць малюнкі, відэа, тэкст для аналізу, упісваць словы, словазлучэнні ці сказы ў адказы. Указаныя рэсурсы дапамагаюць аўтаматычна правяраць выкананыя заданні.

Сэрвіс ***LearningApps.org*** дазваляе ствараць электронныя інтэрактыўныя заданні, якія можна выкарыстоўваць на розных этапах занятку, а таксама ў якасці дамашняга задання. Указаны сэрвіс дапамагае выкладчыку арганізаваць работу ў студэнцкім калектыве, стварыць індывідуальны накірунак вывучэння дысцыпліны, папоўніць свой банк матэрыялаў па прадмеце (https://learningapps.org/display?v=pv44xe5u524).

Для стварэння ментальных карт выкладчыкі актыўна ўжываюць ***Lucidchart*** – сэрвіс, які дапамагае сістэматызаваць вывучаны матэрыял. Студэнты могуць самастойна ствараць ментальныя карты, якія дазваляюць структураваць вялікі аб’ём інфармацыі, а дзякуючы гэтаму працэс запамінання матэрыялу адбываецца значна хутчэй.

Анлайн-сэрвіс ***Smore*** прызначаны для стварэння мультымедыйных флаераў, у якіх могуць быць прадстаўлены тэксты, аўдыё- і відэафайлы, фатаграфіі і ілюстрацыі, спасылкі на інтэрактыўныя заданні, створаныя на знешніх рэсурсах, і гіперспасылкі.

Сэрвіс ***Blendspace*** дае магчымасць ствараць інтэрактыўныя рабочыя лісты выкладчыка, інтэрактыўныя плакаты. Студэнты могуць ствараць свае праекты.

Зварот да сэрвісаў ***Blendspace*** і ***Smore*** будзе эфектыўным на першых і апошніх занятках пры вывучэнні медыцынскай лексікі. На першых занятках дадзеныя рэсурсы даюць студэнтам магчымасць цэласна ўспрыняць тэму, якая будзе вывучацца на працягу наступных заняткаў, а пры падагульненні вывучанага дапамогуць сістэматызаваць веды па пройдзеным матэрыяле.

Павышэнню эфектыўнасці вучэбных заняткаў садзейнічае выкарыстанне прыёму "Воблака слоў (тэгаў)" – сэрвіс для стварэння і іх публікацый ***WordArt.com***. На вучэбных занятках па беларускай мове "Воблака слоў (тэгаў)" прымяняецца на этапе рэфлексіі пры падвядзенні вынікаў, а пры правядзенні слоўнікавай работы гэты прыём актывізуе студэнтаў на атрыманне ведаў, выклікае цікавасць ў пошуку правільных слоў.

Інтэрнэт-рэсурсы эфектыўна выкарыстоўваць для пошуку дадатковай інфармацыі. Напрыклад, электронны слоўнік ***skarnik.by*** дазваляе мабільна перакладаць медыцынскую тэрміналогію з рускай мовы на беларускую, што значна пашырае лексічны запас навучэнцаў.

У апошняе дзесяцігоддзе ўсё большую актуальнасць набывае прымяненне інфаграфікі ў працэсе навучання. Сярод папулярных рэсурсаў вылучаецца

***Canva***. Дадзены сэрвіс з'яўляецца кросплатформавым, дзе ўжываецца графічны дызайн. Ён дазваляе ствараць шаблоны, плакаты, крэатыўныя відэа. У дадзенай праграме можна выкарыстоўваць уласныя фота, дапаўняць іх тэкстам, ствараць анімацыю, карыстацца гатовым фотабанкам. Кожны студэнт можа працаваць індывідуальна і пры неабходнасці звяртацца да задання пасля заняткаў.

Напрыклад, перад тым як прапанаваць студэнтам пераклад тэксту "Аппарат движения" з рускай мовы на беларускую, карысна будзе правесці слоўнікава-семантычную работу, накіраваную на папярэджванне моўных памылак. Студэнты звяртаюцца да рэсурса (https://www.canva.com), разглядаюць малюнак шкілета чалавека (малюнак 1), вызначаюць і ўказваюць назвы касцей на беларускай мове:

https://www.canva.com/design/DAF5_odVwMA/xw4NvJhw922zHm3IGPXKfQ/edit?utm_content=DAF5_odVwMA&utm_campaign=designshare&utm_medium=link2&utm_source=sharebutton.




Малюнак 1. – Шкілет чалавека

Выкарыстоўваючы такую форму працы пры вывучэнні будовы цела чалавека, навучэнцы ператвараюцца з пасіўнага суб'екта ў актыўнага. Такі прыём працы дазваляе значна павысіць матывацыю студэнтаў, а таксама садзейнічае асваенню імі прафесійнай лексікі.

Не менш эфектыўнае і выкарыстанне прафесійных медыцынскіх інтэрнэт-парталаў пры арганізацыі самастойнай і індывідуальнай работы студэнтаў.

Выкарыстанне інавацыйных тэхналогій пры вывучэнні медыцынскай лексікі дае магчымасць пашырыць мэтадалагічныя магчымасці працэсу навучання беларускай мове і паказвае практычную накіраванасць вывучаемай дысцыпліны. Распрацоўка і прымяненне на занятках інтэрактыўных заданняў і практыкаванняў з'яўляецца адным з эфектыўных метадаў, які актывізуе працэс пазнання. Ствараецца станоўчая матывацыя ў працэсе навучання беларускай мове, у студэнтаў павышаецца зацікаўленасць у вывучэнні прадмета. Сувязь тэарэтычных ведаў па беларускай мове і практыкі ў інтэрнэт-асяроддзі дапамагае не толькі паглыбіць веды студэнтаў па беларускай мове, але і засвоіць лексічны

матэрыял, неабходны для далейшых вусных і пісьмовых зносін у прафесійнай сферы.

Такім чынам, выкарыстанне інавацыйных тэхналогій пры вывучэнні медыцынскай лексікі (у рамках курса "Беларуская мова: прафесійная лексіка") дае магчымасць выкладчыку творча пашырыць спектр спосабаў падачы навучальнай інфармацыі, дазваляе ажыццяўляць гнуткае кіраванне вучэбным працэсам, з'яўляецца сацыяльна значным і актуальным.

***Літаратура***


1. Гринчук, С.Н. Облачные технологии и сервисы Веб 2.0 в образовательной деятельности: учеб.-метод. пособие / С.Н. Гринчук, И.А. Дзюба, Е.В. Шакель. – Минск: РИВШ, 2023. – 162 с.
2. Захарова, И.Г. Информационные технологии в образовании: учеб.пособие для студ. высш. пед. учеб. заведений. / И.Г. Захарова. –М.: Издательский центр "Академия", 2003. – 192 с.
3. Рапацевич, Е.В. Инновации в образовании: роль информационно-технологической среды // Успехи современного естествознания. – 2013. – № 10. – С. 86-88; URL: https://natural-sciences.ru/ru/article/view?id=32975 (дата доступа: 01.02.2024).